# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 31 (667) | Аўторак, 10 лістапада 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## СВЯТКАВАННЕ СЛАЎНАГА ЮБІЛЕЮ КАСТРЫЧНІКА

Радасныя і хвалюючыя дні перажывае ўвесь савецкі народ. Ён дастойна сустрэў і адзначыў слаўнае 70-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, якая адкрыла новую эру ў развіцці грамадства. Велізарнае ўражанне на кожнага савецкага чалавека, усіх прагрэсіўных людзей нашай планеты зрабіў даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. М. С. Гарбачова «Кастрычнік і перабудова: рэвалюцыя працягваецца», зроблены ім на сумесным урачыстым пасяджэнні Цэнтральнага Камітэта КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР, прысвечаным 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Ён глыбока крануў душы і сэрцы ўсіх, каму дарагая гісторыя нашай Айчыны, хто па-сапраўднаму заклапочаны аб яе далейшым росквіце, эканамічным уздыме, няўхільным паляпшэнні дабрабыту працоўных.



З асаблівым, па-сапраўднаму ўзнёслым настроем у мінулы аўторак сабраліся на агульнаўніверсітэцкі ўрачысты сход, прысвечаны знамянальнаму юбілею ў жыцці нашай краіны, вучоныя, выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты і аспіранты.

Уступным словам сход адкрыў рэктар ГДУ, акадэмік АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Б. В. Бокуць.

З дакладам аб 70-годдзі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі выступіў сакратар парткома універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт М. І. Старавойтаў.

Ва ўрачыстай абстаноўцы загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Гомельскага абкома КПБ Б. М. Збароўскі ўручыў групе членаў універсітэцкага калектыву Ганаровыя граматы ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ за дасягненне найвышэйшых вынікаў ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Рэктар універсітэта Б. В. Бокуць уручыў Дыплом ВЦСПС клубу мастацкай самадзейнасці «Маладосць» (дырэктар А. В. Лысянкоў) за высокія дасягненні ў развіцці мастацкай самадзейнасці, а таксама Ганаровыя граматы і пераходныя вымпелы акадэмічным групам Ф-43 фізічнага, Г-41 гісторыка-філалагічнага і Т-31 эканамічнага факультэтаў, якія занялі адпаведна першае, другое і трэцяе месцы ва універсітэцкім аглядзе-конкурсе на лепшую акадэмічную групу.

Начальнік аддзела кадраў П. А. Савінскі зачытаў загад па універсітэту, у якім калектыў ГДУ павіншаваны са слаўным юбілеем Вялікага Кастрычніка, а лепшым выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам за плённую працу, паспяховую вучобу і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці аб'яўлена падзяка.

Урачысты вечар, у якім прыняла ўдзел таксама загадчыца аддзела прапаганды і агітацыі Цэнтральнага РК КПБ Т. Ф. Любезная, закончыўся вялікім святочным канцэртам.

* * *

7-га лістапада прадстаўнікі ўсіх факультэтаў і іншых структурных падраздзяленняў нашага універсітэта, як і ўсе савецкія людзі, прынялі ўдзел у дэманстрацыі, прысвечанай слаўнаму 70-годдзю Вялікага Кастрычніка. У маналітнай калоне яны прайшлі па вуліцах і Цэнтральнай плошчы ардэнаноснага Гомеля, якая носіць імя ўсім нам дарагога Уладзіміра Ільіча Леніна. Пад чырванню флагаў і транспарантаў ішлі вядучыя вучоныя і маладыя выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты, ветэраны студэнцкага патрыятычнага руху. Сярод дэманстрантаў былі тыя, хто ў гонар 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі за дасягненне найвышэйшых вынікаў ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ, чыя шматгадовая добрасумленная навукова-педагагічная і грамадская праца адзначана Ганаровымі граматамі і Граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

У знамянальны для нашай Радзімы дзень калектыў універсітэта рапартаваў Камуністычнай партыі, Савецкаму ўраду, шматнацыянальнаму народу аб тым, што прыкладзе ўсе намаганні для паспяховай перабудовы вышэйшай школы, зробіць усё неабходнае, каб вядучая вышэйшая навучальная ўстанова Беларускага Палесся выпускала для народнай гаспадаркі краіны сапраўды высокакваліфікаваных, пакамуністычнаму выхаваных маладых спецыялістаў, здольных вырашаць самыя адказныя задачы.

**НА ЗДЫМКАХ: выкладчыкі і студэнты універсітэта на святочнай дэманстрацыі, прысвечанай 70-годдзю Вялікага Кастрычніка.**

Фота М. Высоцкага.



## З УЗНАГАРОДАЙ!

За дасягненні найвышэйшых вынікаў ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Ганаровымі граматамі ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ узнагароджаны:

БОКУЦЬ Барыс Васільевіч — рэктар універсітэта.

ЖАЛОНКІНА Тамара Пятроўна — асістэнт кафедры агульнай фізікі, сакратар партбюро фізічнага факультэта.

ЗЯЛЁНЫ Валерый Пятровіч, студэнт 4-га курса фізічнага факультэта, ленінскі стыпендыят.

ІВАНЮК Аляксей Іванавіч — загадчык кафедры ТСАЭІ.

КАСЦЮЧЭНКАВА Валянціна Малахаўна — загадчыца бібліятэкі.

ЛЫСЯНКОЎ Аляксандр Вітальевіч — дырэктар студэнцкага клуба мастацкай самадзейнасці «Маладосць».

МАКАРЭВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч — старшы выкладчык кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання, сакратар партбюро факультэта фізвыхавання.

МАКСІМЕЙ Іван Васільевіч — загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання.

МАНЬКО Жана Васільеўна — загадчыца кабінета гісторыі КПСС.

ПАЛЯКОЎ Леў Якаўлевіч — дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі, сакратар партбюро матэматычнага факультэта.

ПРАЛЯСКОЎСКІ Юліян Антонавіч — загадчык кафедры хіміі.

САБАЛЕНКА Уладзімір Мікалаевіч — загадчык кафедры рускай літаратуры.

САВЯНОК Эла Аляксееўна — студэнтка 5-га курса матэматычнага факультэта.

СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл Іванавіч — сакратар парткома.

ШАЎЧЭНКА Уладзімір Аляксандравіч — прарэктар па капітальнаму будаўніцтву.

ЯЦКЕВІЧ Людміла Рыгораўна — дацэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.

* * *

За шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць, дасягнутыя поспехі ў развіцці навукі, актыўны ўдзел у грамадскай рабоце і ў сувязі з 70-годдзем Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР узнагароджаны:

**ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ**

ГУЛІЦКІ Мікалай Фёдаравіч — дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта.

МАКСІМЕНКА Мікалай Васільевіч — дэкан фізічнага факультэта.

СЕРДЮКОЎ Анатоль Мікалаевіч — загадчык кафедры оптыкі.

СКОРАВА Аляўціна Аркадзьеўна — загадчыца кафедры АМАЭІ.

ЯЗЭПАВА Тамара Ігнатаўна — дацэнт кафедры гісторыі КПСС.

**ГРАМАТАЙ**

МЕЛЬНІЧЭНКА Ігар Міхайлавіч — дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела.

ПАПКОВА Ніна Іванаўна — загадчыца вучэбнага аддзела.

РУБАН Анатоль Аляксеевіч — загадчык кафедры гісторыі СССР і БССР.

СІЗОНЕНКА Анатоль Міхайлавіч — старшы выкладчык кафедры гісторыі КПСС, дэкан па рабоце з замежнымі студэнтамі.

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта горача віншуюць узнагароджаных таварышаў і жадаюць ім новых поспехаў у працы на карысць нашай Радзімы.

*НА ШЛЯХУ ПЕРАБУДОВЫ*

# За перамены брацца смела

## УНОСІМ ПРАПАНОВЫ

**Нямала часу прайшло з таго дня, як пачалася перабудова вышэйшай школы. Аднак у нашым універсітэце прыкметных перамен яшчэ не адбылося. Ў асноўным усё ідзе па інструкцыях «зверху». Трэба было выбраць старшыню Савета студэнцкага самакіравання — выбралі. Нядаўна быў загад аб выбарах студэнтаў у вучоны савет універсітэта — выбралі. Гэтым, як правіла, справа і заканчваецца. Не ведаем, як на іншых факультэтах, а ў нас, можна сказаць, ніякай асабістай ініцыятывы — ні з боку выкладчыкаў, ні з боку студэнтаў. Першыя заняты работай, другія па прывычцы паўтараюць, што іх ніхто не будзе слухаць і нічога з самакіравання не атрымаецца.**

**Галоўнае ў перабудове вышэйшай школы — павелічэнне часу для самастойнай работы студэнта шляхам скарачэння лекцый і ўвядзення больш гадзін для практычных заняткаў. Такім чынам, шукаюцца рэзервы для таго, каб студэнт часцей знаходзіўся ў бібліятэцы. Аднак мы, студэнты 4-га курса эканамічнага факультэта, усё ж не маем дастаткова часу для гэтага. Мяркуйце самі: заняткі заканчваюцца ў 13 гадзін 35 мін. або ў 15.35. Для работы над першакрыніцамі, напісання курсавых работ штодзённа патрэбна як мінімум тры гадзіны, а яшчэ ж у многіх — заняткі ў спартыўных секцыях. Вось і атрымліваецца, што студэнт ідзе з дому, з інтэрната раніцай і вяртаецца туды позна вечарам. І не зробленымі застаюцца шматлікія справы: не падрыхтаваны да заняткаў, некранутымі ляжаць свежыя газеты, часопісы...**

Немалаважным для паспяховай вучобы студэнтаў, іх здароўя з'яўляецца і тое, ці можа ён у час знаходжання ва універсітэце паабедаць ці нават перакусіць. На жаль, гэтае пытанне застаецца на працягу доўгага часу балючым і нявырашаным. Фізікам, матэматыкам, геолагам пашанцавала крыху больш — у іх побач сталовая, дзе, дарэчы, таксама не заўсёды смачна і танна можна паесці. А нам і гэтага не дасталося. Буфет галоўнага корпуса знаходзіцца пераважна на замку: то вады няма, то дах працякае і вада са столі капае. Яго рамантавалі, але не заўсёды хуткімі тэмпамі. А сёлета ён наогул не адкрыўся. Нам тлумачаць: «Кадраў не хапае для работы ў буфетах». І даводзіцца сядзець нам з раніцы да абеда і нават пазней галоднымі. У такім жа незайздросным стане і выкладчыкі.

Цяпер аб іншай праблеме. У нумары шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» ад 13 кастрычніка мы прачыталі артыкул дацэнта кафедры ўсеагульнай гісторыі Л. М. Гараніна «Перабудова вышэйшай школы і праблемы падрыхтоўкі гісторыкаў». Нас зацікавіла тое, што аўтар напісаў аб Тартускім універсітэце. Бачна, што там студэнтам знайшлі рэзервы часу для самастойнай падрыхтоўкі. Мы абмеркавалі гэты артыкул у сваёй групе і падумалі: «А чаму б і ў нас не паспрабаваць увесці 70-мінутныя лекцыі без перапынку? Дарэчы, нешта падобнае ўжо прымяняецца ў БІІЧТу. Давайце паразважаем разам. Адна пара лекцый з 5-мінутным перапынкам складае 95 мінут. Міжгадзінны 5-мінутны перапынак можна ўбраць адразу. Чаму? Пустая трата часу: студэнт паспявае выйсці з аўдыторыі і зноў зайсці, тое ж і для выкладчыка. Далей, 5—10 мінут у пачатку лекцыі адымае праверка наведвання заняткаў студэнтамі, траціцца на пустыя размовы. Гэтыя 5—10 мінут можна ўбраць з умовай: роўна па званку пачынаецца лекцыя, семінар. Калі ж выкладчык хоча праверыць колькасць студэнтаў, якія прысутнічаюць на яго занятках, то ён можа зрабіць выбарачную праверку (5—10 чал. з групы). За пяць мінут да заканчэння лекцыі працаздольнасць студэнта падае, ён пачынае глядзець на гадзіннік, аўтаматычна закрывае і адкрывае свой канспект, не разумеючы, закончыў выкладчык лекцыю ці не. Атрымалася працяглась пары 70—75 мінут. Напэўна, некаторыя запярэчаць, маўляў, і так не ўкладваемся ў адведзены час, а тут яго яшчэ скарачаюць. Тады, маўляў, наогул часу не будзе хапаць. Будзе. Калі лекцыю чытаць без «лірычных адступленняў», тое ж самае і на семінарскіх занятках. На нашу думку, варта адважыцца на такое. Студэнтам і выкладчыкам трэба ўсебакова абмеркаваць гэта пытанне і паспрабаваць правесці эксперымент. Тады заняткі ў першай змены будуць заканчвацца ў 12 гадзін. Другая — можа пачынацца праз 20 мінут пасля заканчэння першай. Перапынкі паміж парамі можна зрабіць 10-мінутнымі. Пасля другой пары — 5 мінут на зарадку.

У многіх, напэўна, можа ўзнікнуць пытанне: як жа праверыць, сапраўды студэнт займаецца пасля заняткаў у бібліятэцы ці глядзіць захапляючую французскую кінакамедыю? Ад спосаба праверкі ведаў студэнтаў, які існуе ў Тартускім універсітэце, мы адмаўляемся. Атрымліваецца, што той час, на які скараціліся вучэбныя гадзіны, складае яшчэ адну—дзве гадзіны і пераносіцца на вечар для праверкі ведаў студэнтаў. На нашу думку, не зусім зручна стдэнтам ехаць пасля заняткаў у гарадскую бібліятэку (не ўсім жа займацца ва універсітэцкай), а затым вечарам вяртацца ва універсітэт зноў, магчыма з другога канца горада, каб выкладчык праверыў твае веды. Думаем, што і выкладчыкам гэта не зусім зручна. Таму мы прапаноўваем наступны варыянт. На семінарскіх занятках выкладчык робіць беглае апытанне ці праводзіць дыскусію з мэтай праверкі ведаў як мага ў большай колькасці студэнтаў, узроўню іх самападрыхтоўкі. У той жа час выкладчык назначае дадатковы час (1—2 разы ў тыдзень) для гутаркі з тымі студэнтамі, якія нерэгулярна ходзяць на заняткі, не праяўляюць актыўнасць на семінарах і г. д.

І яшчэ. Чытаючы артыкул Л. М. Гараніна, звярнулі ўвагу на такую акалічнасць. Вельмі часта выкладанне прадмета расцягваецца на доўгі час: яго пачынаюць у першым семестры і заканчваюць у другім навучальнага года і нават у першым семестры наступнага года. Гэта значна ўскладняе вучэбны працэс. Было б, на нашу думку, лепш, каб 2—3 прадметы чыталіся па два месяцы, а потым па іх здаваліся экзамены. І мэтазгодна было б, каб родасныя прадметы выкладаліся адначасова, напрыклад, сацыяльна-эканамічная статыстыка і агульная тэрыя статыстыкі.

Мы просім усіх падумаць над нашымі прапановамі. Можна было б правесці іх апрабаванне спачатку на нашым эканамічным факультэце, а затым, калі гэта дасць добрыя вынікі, распаўсюдзіць новае ў вучэбным працэсе і на астатнія факультэты універсітэта. Калі гаварыць шчыра, многія сумняваюцца ў тым, што да нашых прапаноў прыслухаюцца, пойдуць нам насустрач. Але мы спадзяёмся!

**Студэнты групы Т-42 эканамічнага факультэта.**

# ВЫСТАЎКА ТВОРЧАСЦІ

**70-годдзю Вялікага Кастрычніка прысвячалася выстаўка навуковых, мастацка-прыкладных работ выкладчыц і супрацоўніц універсітэта, якую арганізаваў на мінулым тыдні жансавет ГДУ. Яна была адкрыта ў фае актавай залы першага вучэбнага корпуса. На ёй былі прадстаўлены таксама вырабы, малюнкі дзяцей членаў універсітэцкага калектыву.**

**Найбольшую колькасць экспанатаў прадставілі на выстаўку эканамічны і біялагічны факультэты.**

*Вучоныя—вытворчасці*

# ДЛЯ КАМБАЙНАБУДАЎНІКОЎ

**Вытворчае аб'яднанне «Гомсельмаш» — буйнейшае ў краіне па выпуску кормаўборачнай тэхнікі. Аднак яго прадукцыя ў апошнія гады выклікае шмат наранняў па прычыне яе нізкіх эксплуатацыйных якасцей. Пастаўлена задача стварыць такі самаходны кормаўборачны камбайн, які б адпавядаў лепшым зарубежным узорам і нават пераўзыходзіў іх. З гэтай мэтай тут быў створаны часовы навукова-тэхнічны калектыў, у які ўвайшлі не толькі вопытныя канструктары, але і вучоныя. Ад нашага універсітэта да выканання важнай работы падключаліся загадчык кафедры дыфураўненняў У. І. Міроненка, дацэнт Ю. А. Кашын і асістэнт з гэтай жа кафедры П. П. Верасовіч. Яны распрацавалі матэматычную мадэль галоўнага прывада ўніверсальнага энергетычнага сродка і ўнеслі свой уклад у стварэнне двух макетаў кормаўборачных камбайнаў.**

**Работа нашых матэматыкаў атрымала высокую ацэнку. Даследаванні мяркуецца прадоўжыць на аснове гаспадарчага дагавору.**

# УКАРАНЯЮЦЦА РАСПРАЦОЎКІ

**Кафедра оптыкі займае ва універсітэце адно з вядучых месц па аб'ёму выконваемых гаспдагаворных тэм. Сур'ёзная навуковая распрацоўка была выканана яе калектывам на чале з загадчыкам кафедры дацэнтам А. М. Сердзюковым у мінулым годзе. Сёлета яна ўкаранёна ў вытворчасць з эканамічным эфектам 318 тыс. руб.**

**Штогод добрыя паказчыкі па навуковых распрацоўках і ўкараненню атрыманых вынікаў мае кафедра матэматычных праблем кіравання (загадчык кафедры і навуковы кіраўнік тэм — дацэнт І. В. Максімей). Сёлета прадоўжана ўкараненне праграмнага комплексу «Дыспетчар калектыўнага карыстання» і атрыманы эканамічны эфект 50 тыс. руб. А ўсяго ад выкарыстання гэтай навукова-тэхнічнай навінкі за тры гады эканомія дасягнула 868 тыс. руб.**

**Г. МІЦЮРЫЧ,**
**загадчык НДС,**
**кандыдат фізіка-матэматычных навук.**

*Усесаюзная алімпіяда*

# СЯРОД МАЦНЕЙШЫХ У КРАІНЕ

У Харкаўскім інжынерна-эканамічным інстытуце адбылася чарговая штогадовая Усесаюзная алімпіяда «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». У ёй прыняў удзел 51 студэнт — па тры чалавекі ад кожнай саюзнай рэспублікі, гарадоў Масквы і Ленінграда. У саперніцтве маладых даследчыкаў гонар Беларусі абараняў студэнт гр. Т-52 нашага факультэта Аляксей Лішык. Гэта права ён заваяваў як пераможца рэспубліканскага тура алімпіяды.

Конкурс пачаўся з канферэнцыі. На другім яго этапе кожны ўдзельнік павінен быў даць пісьмовыя адказы на тры пытанні. Затым прадстаяла рашаць сітуацыйныя задачы. Спаборніцтва завяршалася рашэннем упраўленчых задач на дысплеях.

Канферэнцыя праходзіла ў васьмі секцыях. Найбольшая колькасць дакладаў была прадстаўлена на секцыю «Удасканальванне гаспадарчага механізма». Тут А. Лішык выступіў з дакладам «Праблемы і задачы прамысловых прадпрыемстваў ва ўмовах пераводу іх на поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне». Строгае журы прысудзіла яму 2,8 бала з трох магчымых, што забяспечыла Аляксею першае месца.

А. Лішык лепш за ўсіх адказаў на пытанне «Удасканальванне аплаты працы ва ўмовах самафінансавання», за што быў узнагароджаны Ганаровай граматай алімпіяды. Некалькі слабей ён выступіў па двух іншых заданнях. Нягледзячы на гэта заняў агульнае восьмае месца. Пры такім вялікім прадстаўніцтве ўдзельнікаў — гэта бясспрэчны поспех.

**Л. ЛАЗУЧЭНКАВА,**
**дацэнт кафедры галіновых эканомік.**

# ДУХОЎНЫ ПАДАРУНАК

У святы прынята дарыць падарункі. Першакурснікам фізічнага факультэта народны універсітэт маральна-эстэтычнага выхавання ГДУ зрабіў падарунак духоўны. Адбылася цікавая, захапляючая сустрэча двух пакаленняў: маладых людзей, якія толькі ўступаюць у самастойнае жыццё, і тых, хто прайшоў па ім, зведаўшы нямала цяжкасцей.

Рэктар народнага універсітэта дацэнт Т. П. Гараніна расказала першакурснікам пра яго факультэты, паведаміла, што фізікі прадстаўлены ў ім факультэтам «Чалавек і кніга», працуюць на якім выдатныя людзі — дэкан М. В. Максіменка, сакратар партбюро Т. П. Жалонкіна, дацэнты Л. Х. і У. А. Антропавы — цікавыя субяседнікі, творча багатыя асобы. Т. П. Гараніна пажадала першакурснікам актыўнага ўдзелу ў рабоце народнага універсітэта, быць чэснымі ў адносінах з людзьмі, багатымі духоўна.

Затым выступіла заслужаная артыстка БССР Н. А. Карнеева. Яна расказала пра свае студэнцкія гады, аб рабоце ў тэатры, пра тое, чым жыве яна цяпер, што яе хвалюе. Ніна Аляксееўна закранула адну з важных тэм савецкай літаратуры, мастацтва жывапісу, драматургіі — ленінскую тэму. Вобразу Уладзіміра Ільіча адведзена ў іх асаблівае месца. У першыя гады пасля смерці правадыра ніхто з літаратараў не адважваўся адлюстраваць у сваіх творах Леніна такім, якім ён быў у жыцці. Першым гэта зрабіў У. Маякоўскі ў сваёй паэме. Затым да дарагога ўсім нам вобраза звярнуліся М. Горкі, Н. К. Крупская, К. Паўстоўкі. А ў 1932 годзе ў Маскоўскім тэатры адбылася прэм'ера спектакля па п'есе М. Пагодзіна «Чалавек з ружжом». У ролі Леніна выступіў артыст Б. Шчукін. Цяпер вобраз правадыра рэвалюцыі — адзін з галоўных у савецкім мастацтве.

Н. А. Карнеева пажадала першакурснікам узбагачаць свае веды дзякуючы цеснай сувязі з народным універсітэтам маральна-эстэтычнага выхавання, быць цікавымі і духоўна багатымі людзьмі.

На памяць аб сустрэчы студэнты ўручылі заслужанай артыстцы кветкі, а сакратар партбюро факультэта Т. П. Жалонкіна падзякавала Н. А. Карнеевай за цікавую гутарку і ўручыла ёй Ганаровую грамату.

**С. ДЗЕРУЖКОЎ,**
**студэнт гр. Ф-21,**
**рэдактар насценнай газеты «Праметэй» фізічнага факультэта.**

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

**Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый і гутарак сярод студэнтаў ў лістападзе 1987 г.**

**1. Эканамічная рэформа— рашаючы этап перабудовы** (Аб абавязку і адказнасці працоўных калектываў, кожнага работніка за ўсебаковую падрыхтоўку і паспяховае ажыццяўленне перабудовы ўсіх звенняў гаспадарчага механізма).

У аснову палітінфармацый і гутарак на гэту тэму пакласці ацэнкі, вывады і ўстаноўкі, выкладзеныя ў дакументах і рашэннях восьмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР адзінаццатага склікання, выступленнях М. С. Гарбачова у Мурманску і Ленінградзе.

**2. Па шляху паскарэння рэалізацыі Харчовай праграмы** (Да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу — 16 лістапада).

Матэрыялы публікуе «Сельская газета».

**3. Высокае прызванне сацыялістычнай культуры** (Аб ролі савецкай літаратуры і мастацтва ў выхаванні грамадзянскіх якасцей чалавека, у глыбокім пазнанні ім гісторыі, свету і часу).

У гутарках і палітінфармацыях рэкамендуецца выкарыстаць артыкул на гэту тэму, апублікаваны ў часопісе «Коммунист», № 15 за 1987 г.

**4. Мэта СССР — мір і бяспека народаў.** (Дасягненне пагадненняў паміж СССР і ЗША — рэальны шлях да міру, стварэння надзейнай бяспекі для ўсіх народаў планеты).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

**5. Капіталізм без прыкрас: права на бяспраўе і беззыхоўнасць** (Аб велізарным разрыве паміж канстытуцыйнымі прадпісаннямі і рэальнай рэчаіснасцю ў ЗША і іншых краінах капіталу).

Матэрыял апублікаван у часопісе «Коммунист Белоруссии» № 9 за 1987 г.

